# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ФЕАДАЛЬНАЙ БЕЛАРУСІ

Вывучэнне гістарычнай спадчыны з пазіцый марксізма-ленінізма з'яўляецца адной з важных задач савецкай гістарыяграфіі. Далейшае ўдасканальванне гістарычнай навукі, яшчэ больш эфектыўная рэалізацыя творчага патэнцыялу ў інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва непасрэдна залежаць разам з іншымі фактарамі ад аналізу шляху, пройдзенага ёю, абагульнення і выкарыстання ўласнага вопыту.

Распрацоўка гісторыі Беларусі як самастойнай галіны гістарычнай навукі пачалася толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Савецкія гісторыкі, усё больш глыбока авалодваючы марксісцка-ленінскай метадалогіяй, шырока разгарнулі вывучэнне гісторыі Беларусі. Адным з галоўных напрамкаў савецкай гістарычнай навукі, які складваўся ў 20—30-я гады, з'явілася даследаванне праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця, палітычнай гісторыі, гісторыі культуры Беларусі феадальнай эпохі. Гэтыя даследаванні былі з поспехам працягнуты і ў пасляваенныя гады.

У 60—80-я гады па праблеме гістарыяграфіі феадальнай Беларусі былі апублікаваны артыкулы З. Ю. Капыскага, А. М. Карпачова, В. І. Мялешкі, брашура А. П. Ігнаценкі «Увядзенне ў гісторыю БССР. Перыядызацыя, крыніцы, гістарыяграфія» (Мінск, 1965), работа Э. Р. Іофэ «Навучальна-метадычны дапаможнік да курса «Гістарыяграфія гісторыі СССР» (Мінск, 1986). Але будучыя гісторыкі — студэнты гістарычных факультэтаў, вучоныя-гісторыкі, настаўнікі гісторыі БССР сярэдніх школ адчувалі патрэбу ў выданні кнігі, у якой бы асвятлялася метадалогія і методыка даследавання як дарэвалюцыйнай, так і савецкай гістарычнай навукі па найбольш актуальных пытаннях гісторыі Беларусі ў эпоху феадалізму. Менавіта гэтым можна растлумачыць цікавасць да кнігі З. Ю. Капыскага і В. У. Чапко «Гістарыяграфія БССР. Эпоха феадалізму», якая нядаўна выйшла ў свет у выдавецтве «Універсітэцкае» *.

Гэты дапаможнік прысвечаны вывучэнню феадальнага перыяду гісторыі Беларусі ў дасавецкай і савецкай гістарыяграфіі. У ім разглядаюцца манаграфічныя даследаванні па гісторыі сялянства і аграрных адносін, прававых прынцыпаў грамадства, класавай барацьбы, феадальнага горада, нацыянальна-вызваленчага, грамадска-палітычнага руху і грамадскай думкі.

Аўтары дапаможніка галоўную ўвагу надаюць тэарэтычнай пазіцыі даследчыкаў, зыходным прынцыпам, на якія яны абапіраюцца, высвятленню значэння кожнай гістарыяграфічнай з'явы для разумення развіцця Беларусі ва ўмовах феадальнага спосабу вытворчасці, паказваюць якаснае адрозненне савецкай гістарыяграфіі ад дваранска-буржуазнай гістарыяграфіі.

Кніга З. Ю. Капыскага, В. У. Чапко «Гістарыяграфія БССР. Эпоха феадалізму» складаецца з трох глаў. У савецкай гістарычнай літаратуры, бадай, нідзе не даецца такога глыбокага аналізу беларускай гістарыяграфіі дасавецкага перыяду, які дадзены ў першай главе. Аўтары акцэнтуюць увагу на характарыстыцы беларускага летапісання XV—XVIII стст., дваранскіх і клерыкальных гісторыкаў, буржуазнай гістарыяграфіі.

Развіццю беларускай савецкай гістарыяграфіі ў даваенны перыяд прысвечана другая глава. Характарызуючы агульныя працы па гісторыі Беларусі, аўтары кнігі адзначаюць, што ў гістарычнай думцы Беларусі ў 30-я гады зацвердзілася марксісцка-ленінскае разуменне гістарычнага працэсу, пераканаўчым сведчаннем чаго можа служыць кніга В. К. Шчарбакова «Нарыс гісторыі Беларусі», ч. 1, якая выйшла ў 1934 г.

На падставе глыбокага вывучэння першага перыяду развіцця беларускай савецкай гістарыяграфіі З. Ю. Капыскі і В. У. Чапко робяць вывад, што заснавальнікам беларускай савецкай гістарычнай школы быў У. І. Пічэта. У другой главе кнігі даецца характарыстыка прац гэтага таленавітага вучонага па аграрных адносінах, палітычнай гісторыі і гісторыі культуры.

Значна паўней, чым у існуючай гістарычнай літаратуры, аналізуюцца працы савецкага гісторыка К. І. Кернажыцкага, асабліва яго манаграфія «Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча яго насельніцтва з XVII да паловы XIX ст.» Знайшлі асвятленне і даследаванні Т. І. Забелы, Д. І. Даўгялы, В. Д. Друшчыца, А. В. Бурдзейкі, У. Краснянскага, Ц. М. Сцяпанава.

Назва трэцяй главы рэцэнзуемай кнігі — «Развіццё гістарыяграфіі ў пасляваенныя гады». У ёй характарызуюцца манаграфічныя даследаванні гісторыкаў і археолагаў па праблемах аграрных адносін, сялянскага руху, прававога становішча насельніцтва, гісторыі гарадоў, грамадска-палітычнага жыцця і ідэйнай барацьбы ў Беларусі ў эпоху феадалізму. Прадметам глыбокага навуковага аналізу тут сталі манаграфіі Д. Л. Пахілевіча «Сяляне Беларусі і Літвы ў XVI—XVIII стст.», «Сяляне Беларусі і Літвы ў другой палавіне XVIII ст.», кнігі П. Р. Казлоўскага «Сяляне Беларусі ў другой палавіне XVII—XVIII стст.», «Магнацкая гаспадарка Беларусі ў другой палавіне XVIII ст.», «Землеваладанне і землекарыстанне ў Беларусі ў XVIII — першай палавіне XIX ст.», працы В. І. Мялешкі «Нарысы аграрнай гісторыі Беларусі (другая палавіна XVII—XVIII ст.)», М. М. Улашчыка «Перадумовы сялянскай рэформы 1861 г. у Літве і Заходняй Беларусі», В. У. Чапко «Сельская гаспадарка Беларусі ў першай палавіне XIX ст.» і інш.

Раскрываючы тэму сялянскага руху ў беларускай савецкай гістарыяграфіі пасля-

---

* Копысский З. Ю., Чепко В. В. Историография БССР. Эпоха феодализма. Минск: Университетское, 1986. 175 с.

ваенных гадоў, аўтары дапаможніка разглядаюць дзве спецыяльныя манаграфіі: В. І. Мялешкі «Класавая барацьба ў беларускай вёсцы ў другой палавіне XVII—XVIII ст.» і В. У. Чапко «Класавая барацьба ў беларускай вёсцы ў першай палавіне XIX ст.» Шмат каштоўнага знойдуць для сябе студэнты-гісторыкі, калі азнаёмяцца з гістарыяграфічным аглядам прац І. А. Юхо, А. П. Ігнаценкі, М. Ф. Болбаса, З. Ю. Капыскага, А. П. Грыцкевіча, В. У. Чапко, Я. Н. Мараша, С. А. Падокшына, А. М. Мальцава, Л. С. Абецадарскага і іншых беларускіх савецкіх гісторыкаў па розных праблемах гісторыі Беларусі феадальнага перыяду.

Нельга не пагадзіцца з вывадам аўтараў, што манаграфічныя даследаванні па гісторыі Беларусі, якія выйшлі ў пасляваенныя гады, адрозніваюцца важнасцю праблематыкі, глыбінёй і грунтоўнасцю асвятлення пытанняў, доказнасцю вывадаў і абагульненняў, велізарнай колькасцю прыцягнутага для вывучэння фактычнага матэрыялу, значная частка якога ўводзіцца ў навуковы абарот упершыню.

Дапаможнік напісаны простай, даступнай мовай. Навуковасць тут умела спалучаецца з папулярнасцю. Добра, што ў канцы кнігі даецца імянны паказальнік.

Нягледзячы на высокі навукова-тэарэтычны і метадычны ўзровень навучальнага дапаможніка ён, на жаль, не пазбаўлены некаторых недахопаў. Паколькі прадметам агляду ў кнізе сталі манаграфічныя даследаванні, то гэта не дае магчымасці атрымаць поўную карціну вывучэння феадальнага перыяду гісторыі Беларусі ў савецкай гістарыяграфіі. Ёсць вучоныя, якія не напісалі манаграфій, але з'яўляюцца аўтарамі арыгінальных артыкулаў па вузлавых пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў эпоху феадалізму. Мы маем на ўвазе А. М. Карпачова, які на аснове аналізу сацыяльна-эканамічнага ладу вотчынных мануфактур раскрыў дэфармацыю феадальных вытворчых адносін у напрамку генезісу капіталізму, зрабіў вывад, што ў гэты перыяд Беларусь уступіла ў «сыходную» стадыю развіцця феадалізму. Даследаванні А. М. Карпачова пераканаўча абгрунтавалі правамернасць вылучэння другой палавіны XVIII ст. як этапа ў развіцці эканомікі Беларусі, які змяшчае якасна новыя з'явы.

Далей, калі аўтары аналізуюць толькі манаграфічныя даследаванні, то чаму з поля іх зроку выпалі такія каштоўныя манаграфіі, як праца В. К. Шчарбакова «Сялянскі рух і казацтва на Беларусі» (Мінск, 1935), кніга М. Т. Раманоўскага «Развіццё мануфактурнай прамысловасці ў Беларусі (другая палавіна XVIII — першая палавіна XIX ст.)» (Мінск, 1966)?

На с. 78 сцвярджаецца, што «работа К. І. Кернажыцкага «Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча яго насельніцтва з XVII да паловы XIX ст.»— першае манаграфічнае даследаванне па аграрнай гісторыі Беларусі ў эпоху феадалізму ў беларускай савецкай гістарыяграфіі». Гэта даследаванне Кернажыцкага выйшла ў свет у 1931 г. Ну, а як жа тады лічыць кнігу У. І. Пічэты «Гісторыя сельскай гаспадаркі і землеўладання ў Беларусі, ч. 1 (да канца XVI ст.)», якая была выдадзена ў 1927 г., на чатыры гады раней?

Гаворачы аб абагульняючых працах па гісторыі Беларусі, аўтары рэцэнзуемай кнігі першай называюць аглядны артыкул М. К. Любаўскага «Літоўска-Беларуская дзяржава ў пачатку XVI сталецця» (с. 67), надрукаваны ў 1926 г. Але ж былі працы, якія выйшлі раней. Мы маем на ўвазе артыкул У. І. Пічэты «Гісторыя беларускага народа», апублікаваны ў зборніку «Курс беларусазнаўства» (М., 1918—1920, с. 1—86), першую частку яго кнігі «Гісторыя Беларусі» (1924), артыкул В. Д. Друшчыца «Галоўныя моманты гісторыі беларускага народа» (у зборніку «Беларусь». Мінск, 1924).

Шкада, што аўтары кнігі надалі мала ўвагі выкрыццю поглядаў беларускіх нацыяналістаў па вузлавых пытаннях гісторыі Беларусі ў эпоху феадалізму.

Выхад у свет навучальнага дапаможніка «Гістарыяграфія БССР. Эпоха феадалізму» — гэта першы вопыт падобнага роду літаратуры ў нашай рэспубліцы. І вопыт, безумоўна, удалы.

*Э. Р. ІОФЭ*

## ПЕРШАЯ КНІГА ПА ГІСТОРЫІ ГАРАДСКОГА ПАСЁЛКА МІР

Выхаванне працоўных у духу патрыятызму і інтэрнацыяналізму — адна з галоўных задач ідэалагічнай работы. Эфектыўным сродкам фарміравання нацыянальнай гордасці і любві да бацькаўшчыны, да зямлі, дзе чалавек нарадзіўся і вырас, да савецкай Айчыны служыць краязнаўчая літаратура, у прыватнасці па гісторыі населеных пунктаў. Значны ўклад у гэту важную і адказную справу ўносяць выдавецтвы нашай рэспублікі. За апошнія два дзесяцігоддзі па гісторыі гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу Беларусі апублікаваны некалькі дзесяткаў кніг, пераважна ў жанры гісторыка-эканамічных нарысаў. Аднак, нягледзячы на гэта і на тое, што Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР разам з іншымі інстытутамі приступіў да стварэння шасцітомнай працы аб гарадах і вёсках Беларусі, мінулае многіх яе гарадоў, амаль усіх пасёлкаў гарадскога тыпу і больш за 25 тысяч вёсак усё яшчэ чакае сваіх даследчыкаў. Чар-